Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 СНЕЖНЯ 2016 г. СУБОТА № 244 (28354)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Калі сына ўкраў тата...**

СТАР. 5



**Будзь пільным! Асабліва падчас палявання**

СТАР. 7



**Такое вось «кіно»**

СТАР. 12

# Зарачанскае ралі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ала НІЖНІК — гаспадыня аграсядзібы «Зарачаны» ў аднайменнай вёсцы Пухавіцкага раёна на сваім квадрацыкле аб'язджае тэрыторыю сядзібы перад прыездам чарговых турыстаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Нам трэба сёння стварыць у краіне сістэму кантрольнай дзейнасці на чале з КДК (свайго роду кантрольную вертыкаль), якая б забяспечыла наданне гэтай дзейнасці чалавечага твару. Галоўная мэта — не ў тым, каб выявіць правапарушэнне, а больш у прафілактычнай накіраванасці дзейнасці кантрольных органаў. Не перашкаджаць у рабоце суб'ектам гаспадарання праз тыя паўнамоцтвы, якія дадзены заканадаўствам кантрольным органам. «Не нашкодзь» — гэты медыцынскі прынцып сёння павінен быць галоўным у рабоце любога назіральнага або кантрольнага органа краіны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9726 | ▼ |
| Еўра | 2,0599 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0319 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0748 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жыллё

## ЧАС РАЗЛІЧВАЦЬ НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ

### Налета з'явіцца нацыянальнае агенцтва па іпатэцы, а індывідуальнае жыллё можна будзе ўзводзіць паэтапна



**Даволі складаны для эканомікі год не быў выключэннем і для будаўнічай сферы. Праблем хапала з недастатковым фінансаваннем праектаў, скарачэннем ільготнага крэдытавання і памяншэннем даходаў у насельніцтва. Усё гэта так, але вызначаныя ўрадам задачы галіной выконваліся няглядзячы ні на што. Напрыканцы года можна ўжо крыху падсумаваць папярэднія вынікі і зазірнуць у дзень заўтрашні. Аб рэаліях і перспектывах змянення ўмоў жыллёвага будаўніцтва ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» расказвае начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

СТАР. 4

■ Зімовы адпачынак

## Сезон адкрыты!

### Лыжы, санкі, снаўборды, канькі — дзе і колькі яны каштуюць?

**Надвор'е ў краіне ўсё больш відавочнымі намёкамі нагадвае пра тое, што прыйшла пара перабірацца з трэнажорнай залы, басейнаў і іншых спартыўных пляцовак на снежныя схілы. Наперадзе амаль тры доўгія месяцы зімы, таму, каб перажыць холад бязбольна, весела і з карысцю для здароўя, лепш абраць для сябе актыўны адпачынак. Таму мы здзейснім віртуальны экскурс па гарналыжных комплексах сталіцы і найбліжэйшых да Мінска тэрыторыях, каб падзяліцца з чытачамі «Звязды» самымі цікавымі прапановамі спартыўных цэнтраў.**



**«Сонечная даліна»**

Гэта месца ідэальна падыходзіць для тых, хто не валодае асабістым транспартам ці проста не жадае выбірацца за межы Мінска. «Сонечная даліна» знаходзіцца ў сталіцы, у Курасоўшчыне, і мае зручную транспартную сувязь з усімі раёнамі горада. Комплекс працуе ў будныя, выхадныя і святочныя дні да 22 гадзін. Там ёсць усё для актыўнага адпачынку і нават для свята, як для карпаратыўнага, так і для сямейнага. На працягу ўсяго года ў цэнтры можна зняць альтанку з мангалам, дзе добра ладзіць пікнікі. Такое задавальненне абыдзецца ад 8 да 16 рублёў у залежнасці ад дня і колькасці чалавек.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА, 5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!